# КАФЕДРА АДСВЯТКАВАЛА ЮБІЛЕЙ



Трыццацігадовы юбілей адзначыла кафедра інфарматыкі і інфармацыйных тэхналогій нашай ВНУ. Пачалося свята ў музеі гісторыі ўніверсітэта, дзе калектыў кафедры, ветэраны педагагічнай працы, госці з ліку выпускнікоў матэматычнага факультэта (сёння – факультэт матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій), яго адміністрацыя змаглі пазнаёміцца з выставай «Гісторыя развіцця вылічальнай тэхнікі». З цікавасцю прысутныя разглядалі экспанаты: тэставую апаратуру, тэхнічнае абсталяванне і прыборы, што былі зроблены ва ўніверсітэце і выкарыстоўваліся ў вучэбным працэсе напрыканцы 80-х гадоў. Такі своеасаблівы падарунак падрыхтавала В.У. Пуцеева, метадыст аддзела па выхаваўчай рабоце з моладдзю. Вольга Уладзіміраўна таксама прадаставіла некаторыя фотаматэрыялы для прэзентацыі, з якой пазнаёміла прысутных выконваючы абавязкі загадчыка кафедры Таццяна Рыгораўна Алейнікава.







Слайды з фотаздымкамі супрацоўнікаў кафедры мяняліся і быццам вярталі ў мінулае, у той час, калі толькі ўзнікаў інтарэс да інфарматыкі і да камп'ютараў увогуле. Таццяна Рыгораўна, як і ўсе прысутныя, успомніла дэкана факультэта Мікалая Ягоравіча Бальшакова, які заўжды клапаціўся пра будучыню факультэта, а таксама загадчыка кафедры Аляксандра Іванавіча Бочкіна, які ўзначальваў яе 25 гадоў. Дарэчы, Аляксандра Іванавіча за яго прафесіяналізм любілі і паважалі ўсе. У выкладчыка былі надзвычай цікавыя і змястоўныя лекцыі, часам з жарточкамі, што нярэдка цытавалі студэнты.

Дзякуючы дэкану і загадчыку кафедры ў 1995 годзе на факультэце былі адкрыты новыя спецыяльнасці магістратуры і аспірантуры, а некаторыя з выпускнікоў і сёння працуюць на факультэце. Калі гаварыць пра кафедру ўвогуле, то трэба адзначыць, што ўсе сямнаццаць выкладчыкаў шчыруюць зладжана, самааддана і, што самае галоўнае, на высокім прафесійным узроўні. Хоць некаторым педагогам больш за пяцьдзясят, яны не толькі вучаць, але і самі вучацца. Без гэтага, як яны сцвярджаюць, нельга: інфармацыйныя тэхналогіі сёння не стаяць на месцы, а пастаянна развіваюцца і ўдасканальваюцца.

Але ж вернемся да мерапрыемства і акунемся ў атмасферу, якая панавала ў той дзень у музеі гісторыі ўніверсітэта. Юбіляраў віншавалі першы прарэктар універсітэта В.В. Маліноўскі, дэкан факультэта матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій А.М. Залеская, загадчыкі іншых кафедраў, выпускнікі. І столькі было сказана шчырых і добрых слоў у адрас калектыву кафедры!

А старшыня прафкама работнікаў універсітэта Дзмітрый Алегавіч Стрык уручыў граматы прафкама ветэрану кафедры Галіне Сцяпанаўне Міхневіч, дацэнтам Наталлі Дзмітрыеўне Адаменка і Уладзіміру Мікітавічу Лабоўкіну. А вось Людмілу Яўгенаўну Патапаву ўсе віншавалі яшчэ і з юбілейным днём нараджэння. Ёй была ўручана грамата ўніверсітэта.

Трошкі пазней сваіх падначаленых па скайпе вітаў загадчык кафедры А.А. Цараў, які зараз вучыцца ў Рэспубліцы Карэя. Аляксандр Аляксандравіч пажадаў свайму калектыву плёну ў працы, творчых поспехаў і здароўя.

**Настасся ЛАЗЕБНАЯ.**

**На здымках:** падчас святкавання 30-годдзя кафедры інфарматыкі і інфармацыйных тэхналогій.

**Фота аўтара.**